ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 30 (230) | Субота, 30 кастрычніка 1976 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

### АБ ПЛЕНУМЕ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА

**25 кастрычніка 1976 года адкрыўся чарговы Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС.**

**Пленум заслухаў даклады намесніка Старшыні Савета Міністраў СССР, старшыні Дзяржплана СССР тав. М. К. Байбакова «Аб Дзяржаўным пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1976—1980 гады і аб Дзяржаўным плане развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1977 год» і міністра фінансаў СССР тав. В. Ф. Гарбузава «Аб Дзяржаўным бюджэце СССР на 1977 год і аб выкананні Дзяржаўнага бюджэту СССР за 1975 год».**

**На Пленуме з вялікай прамовай выступіў Генеральны сакратар ЦК КПСС тав. Л. І. Брэжнеў. Прамова публікуецца ў друку.**

**У спрэчках па дакладах выступілі: тт. У. В. Шчарбіцкі — першы сакратар ЦК Кампартыі Украіны, Д. А. Кунаеў — першы сакратар ЦК Кампартыі Казахстана, М. С. Саломенцаў — Старшыня Савета Міністраў РСФСР, Ц. Я. Кісялёў — — Старшыня Савета Міністраў Беларускай ССР, Г. А. Аліеў — першы сакратар ЦК Кампартыі Азербайджана, В. В. Грышын — першы сакратар Маскоўскага гаркома КПСС, С. Ф. Медуноў — першы сакратар Краснадарскага крайкома КПСС.**

**26 кастрычніка 1976 года Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС прадоўжыў абмеркаванне пытанняў аб Дзяржаўным пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1976—1980 гады, Дзяржаўным плане развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1977 год, аб Дзяржаўным бюджэце СССР на 1977 год і аб выкананні Дзяржаўнага бюджэту СССР за 1975 год.**

**У спрэчках па гэтых пытаннях выступілі тт. Р. В. Раманаў — першы сакратар Ленінградскага абкома КПСС, Ш. Р. Рашыдаў — першы сакратар ЦК Кампартыі Узбекістана, А. В. Каваленка — першы сакратар Арэнбургскага абкома КПСС, Р. Ф. Гаражаева — звеннявая кукурузаводчага звяна саўгаса «Залатароўскі» Растоўскай вобласці, М. Г. Гапураў першы сакратар ЦК Кампартыі Туркменістана, П. Ф. Ламака — міністр каляровай металургіі СССР, Ф. Т. Маргун — першы сакратар Палтаўскага абкома Кампартыі Украіны, В. К. Месяц — міністр сельскай гаспадаркі СССР, Г. І. Марчук — віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук СССР, старшыня Сібірскага аддзялення Акадэміі навук СССР, Г. Л. Міхайлаў — токар Харкаўскага завода транспартнага машынабудавання імя В. А. Малышава, А. Э. Вос — першы сакратар ЦК Кампартыі Латвіі, К. Н. Руднеў — міністр прыборабудавання, сродкаў аўтаматызацыі і сістэм кіравання.**

**Пленум ЦК КПСС прыняў па абмеркаваных пытаннях адпаведную пастанову, якая публікуецца ў друку.**

**Пленум ЦК КПСС разгледзеў арганізацыйныя пытанні.**

**Пленум выбраў сакратаром ЦК КПСС тав. Я. П. Рабава.**

**Пленум перавёў з кандыдатаў у члены ЦК КПСС тт. В. А. Карлава, К. Н. Беляка, Ф. Т. Маргуна.**

**На гэтым Пленум Цэнтральнага Камітэта закончыў сваю работу.**

## УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

### АБ УЗНАГАРОДЖАННІ ТАВ. БОКУЦЯ Б. В. ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

За актыўную навукова-педагагічную дзейнасць і ў сувязі з пяцідзесяцігоддзем з дня нараджэння ўзнагародзіць рэктара Гомельскага дзяржаўнага універсітэта тав. **Бокуця** Барыса Васільевіча Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

**Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР**
**Ф. СУРГАНАЎ.**
**Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР**
**Л. ЧАГІНА.**

26 кастрычніка 1976 года.
г. Мінск.

## ВЕЛІЧНАЯ ПРАГРАМА БУДАЎНІЦТВА

### Пятая сесія Вярхоўнага Савета СССР дзевятага склікання

Савецкія людзі паспяхова выконваюць рашэнні XXV з'езда КПСС, накіраваныя на далейшае нарошчванне эканамічнага патэнцыялу краіны, няўхільны ўздым узроўню жыцця, удасканаленне сацыялістычных грамадскіх адносін, далейшы рух да камунізму. Рашэнні з'езда выклікалі новы ўздым палітычнай і працоўнай актыўнасці мас.

Напярэдадні сесіі Вярхоўнага Савета СССР адбыўся Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС. З вялікай прамовай на Пленуме выступіў Генеральны сакратар ЦК КПСС таварыш Л. І. Брэжнеў. У прамове дадзена ясная і канкрэтная праграма дзеянняў савецкага народа па ажыццяўленню рашэнняў XXV з'езда КПСС.

Пленум цалкам і поўнасцю адобрыў дзейнасць Палітбюро ЦК КПСС па рэалізацыі сацыяльна-эканамічнай праграмы і знешнепалітычнага курсу, распрацаваных XXV з'ездам партыі, палажэнні і вывады, змешчаныя ў прамове таварыша Л. І. Брэжнева. На Пленуме намечана эфектыўная тактыка выканання народнагаспадарчых планаў, выдзелены тыя палажэнні пяцігадовага і гадавога планаў, якія патрабуюць асаблівай увагі партыйных, камсамольскіх, савецкіх і гаспадарчых органаў, найбольшай канцэнтрацыі сіл партыі і народа.

Пленум ЦК КПСС у асноўным адобрыў праект дзесятага пяцігадовага плана і бюджэту на 1977 год. Пленум пастанавіў унесці іх на разгляд сесіі Вярхоўнага Савета СССР.

27 кастрычніка ў Маскве, у Вялікім Крамлёўскім палацы, пачала работу пятая сесія Вярхоўнага Савета СССР дзевятага склікання.

Дэпутаты аднагалосна зацвердзілі парадак дня сесіі, а таксама парадак яе работы.

У парадку дня сесіі пытанні:

1. Аб намесніках Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад Украінскай ССР, Грузінскай ССР і Літоўскай ССР.
2. Аб Дзяржаўным пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1976—1980 гады.
3. Аб Дзяржаўным плане развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1977 год.
4. Аб Дзяржаўным бюджэце СССР на 1977 год і аб выкананні Дзяржаўнага бюджэту СССР за 1975 год.
5. Аб праекце Закона СССР «Аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры».
6. Аб утварэнні пастаянных камісій Савета Саюза і Савета Нацыянальнасцей па пытаннях працы і быту жанчын, аховы мацярынства і дзяцінства.
7. Аб зацвярджэнні Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

Дэпутаты аднагалосна выбралі намеснікамі Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР: ад Украінскай ССР — дэпутата **А. Ф. Ватчанку,** Старшыню Прэзідыума Вярхоўнага Савета Украінскай ССР, ад Грузінскай ССР — дэпутата **П. П. Гілашвілі,** Старшыню Прэзідыума Вярхоўнага Савета Грузінскай ССР, ад Літоўскай ССР — дэпутата **А. С. Баркаўскаса,** Старшыню Прэзідыума Вярхоўнага Савета Літоўскай ССР.

Па другому і трэцяму пытаннях парадку дня з дакладам выступіў намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР, старшыня Дзяржплана СССР дэпутат **М. К. Байбакоў.**

Па чацвёртаму пытанню парадку дня з дакладам «Аб Дзяржаўным бюджэце СССР на 1977 год і аб выканнні Дзяржаўнага бюджэту СССР за 1975 год» выступіў міністр фінансаў СССР дэпутат **В. Ф. Гарбузаў.**

На гэтым першае сумеснае пасяджэнне Савета Саюза і Савета Нацыянальнасцей закончылася.

У 16 гадзін у зале пасяджэнняў палат пад старшынствам старшыні Савета Саюза дэпутата **А. П. Шыцікава** адкрылася першае пасяджэнне Савета Саюза Вярхоўнага Савета СССР.

З садакладам планава-бюджэтнай, галіновых камісій і камісіі па справах моладзі Савета Саюза, па пытаннях аб Дзяржаўным пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1976—1980 гады, Дзяржаўным плане развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1977 год і Дзяржаўным бюджэце СССР на 1977 год, а таксама аб выкананні Дзяржаўнага бюджэту за 1975 год выступіў старшыня планава-бюджэтнай камісіі дэпутат **Г. І. Вашчанка.**

Затым у Савеце Саюза пачаліся спрэчкі па пытаннях аб Дзяржаўным пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1976—1980 гады, аб Дзяржаўным плане развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1977 год, Дзяржаўным бюджэце СССР на 1977 год і аб выкананні Дзяржаўнага бюджэту СССР за 1975 год.

28—29 кастрычніка сесія Вярхоўнага Савета СССР працягвала работу.

## АБ ВЫХАВАННІ ПРАЦОЎНЫХ

Гомельскі абласны камітэт КП Беларусі правёў двухдзённую навукова-практычную канферэнцыю на тэму: «Паглыбленне і ўдасканальванне патрыятычнага выхавання працоўных». На гэтай канферэнцыі з дакладамі выступілі і вучоныя нашага ўніверсітэта: загадчык кафедры гісторыі КПСС, дацэнт А. П. Мяшчэрскі — «Характэрныя рысы і асаблівасці савецкага патрыятызму ва ўмовах развітага сацыялістычнага грамадства», прафесар кафедры філасофіі М. І. Рубцоў — «Праблемы адзінства інтэрнацыянальнага і патрыятычнага выхавання ў працэсе камуністычнага выхавання працоўных», загадчык кафедры палітэканоміі, дацэнт М. М. Маёраў — «Праца ў імя камунізму — аснова патрыятычнага выхавання», загадчык кафедры беларускай літаратуры, прафесар М. М. Грынчык — «Літаратура і мастацтва як важнейшы сродак патрыятычнага выхавання», загадчык кафедры філасофіі, дацэнт У. М. Калмыкоў—«Крытыка буржуазных фальсіфікацый сутнасці савецкага патрыятызму».



**У сістэме партыйнай асветы выкладчыкаў эканамічнага факультэта створаны тэарэтычны семінар па праблемах сацыялістычнага ладу жыцця. Яго вядзе дацэнт кафедры палітэканоміі У. Ц. Смірноў.**

**Чарговыя заняткі семінара па тэме «XXV з'езд КПСС аб сацыялістычным ладзе жыцця як аб вялікай заваёве сацыялізму» адбыліся ў мінулы аўторак. Перад ізлажэннем гэтай тэмы прапагандыст растлумачыў слухачам асноўныя палажэнні прамовы Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева на Пленуме ЦК КПСС,**

## ПРАФСАЮЗНЫЯ КАНФЕРЭНЦЫІ

28 кастрычніка адбылася справаздачна-выбарная прафсаюзная канферэнцыя прафесарска - выкладчыцкага, вучэбна-дапаможнага і адміністрацыйна - гаспадарчага саставу ўніверсітэта. На ёй заслуханы і абмеркаваны справаздача старшыні мясцкома **А. В. Саннікавай** аб праведзенай за год рабоце, даклад старшыні рэвізійнай камісіі **І. К. Кекіша,** выбраны новыя кіруючыя органы і дэлегаты на абласную прафсаюзную канферэнцыю.

У рабоце канферэнцыі прыняла ўдзел старшыня абкома прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў **В. П. Марозава.**

□

Учора ў актавай зале ўніверсітэта праведзена VI студэнцкая прафсаюзная канферэнцыя. Яе дэлегаты заслухалі і абмеркавалі справаздачныя даклады старшыні прафкома **Н. Колтышавай** і старшыні рэвізійнай камісі **У. Дзюбо.**

На прафсаюзнай канферэнцыі выбраны новыя составы прафкома і рэўкамісіі, дэлегаты на абласную прафсаюзную канферэнцыю.

**Матэрыялы аб прайшоўшых прафсаюзных канферэнцыях будуць змешчаны на старонках нашай газеты.**

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, партком, выкладчыкі і студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта горача віншуюць ЛАШКЕВІЧ Валянціну Афанасьеўну з кафедры беларускай літаратуры з выпадку зацвярджэння яе ВАКам у вучоным званні дацэнта.**

*НАШЫ ЮБІЛЯРЫ*

# У КЛОПАТАХ КОЖНАГА ДНЯ...

## Рэктару ўніверсітэта Б. В. БОКУЦЮ—50 гадоў

Нельга дакладна вымераць усё тое, што перажыта і зроблена чалавекам. Аднак сярод нас ёсць такія людзі, жыццё якіх умясціла ў сябе вельмі многае. Пра такіх мы гаворым, як пра людзей асаблівага, а іншы раз і выключнага лёсу. У гэтым сэнсе адметным з'яўляецца і жыццёвы шлях Барыса Васільевіча Бокуця.

Яго дзяцінства апаліла вайна. Канешне, ад гэтага, бывае, шчыміць сэрца. Разам з тым яно напаўняецца і гордасцю ад ўсведамлення таго, што таксама ўнёс асабісты ўклад у перамогу над гітлераўскімі фашыстамі. Барысу Васільевічу было ўсяго толькі 15, калі ён стаў падпольшчыкам, народным мсціўцам. Давялося яму ў баях прайсці і франтавымі дарогамі. Чырвонаармейцам стаў добраахвотна.

Барацьба супраць ворага загартавала, навучыла Б. В. Бокуця па-сапраўднаму цаніць жыццё і перш за ўсё аддаваць яго людзям, абранай справе.

Ужо ў аддаленыя гады маладосці Барыс Васільевіч добра зразумеў, што ён здолее быць найбольш карысным для грамадства, сваёй Радзімы толькі тады, калі няспынна і нястомна будзе абагачаць сябе ведамі. Вось чаму з першых жа пасляваенных гадоў яго з неаслабнай прагнасцю цягнула да кніг. Барыс Васільевіч спачатку выдатна заканчвае сярэднюю школу, а затым і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У. І. Леніна.

Першыя крокі ў навуку былі зроблены Б. В. Бокуцем у студэнцкія гады. Таму не выпадкова яго як аднаго з лепшых выпускнікоў БДУ рэкамендавалі і прынялі ў аспірантуру пры кафедры тэарэтычнай фізікі. Малады даследчык удумліва і плённа працаваў над абранай тэмай, своечасова падрыхтаваў і паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю.

Далейшая працоўная дзейнасць вучонага амаль на працягу 18 гадоў была звязана з ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга Інстытутам фізікі АН БССР. Тут Барыс Васільевіч пачынаў з пасады малодшага навуковага супрацоўніка і вырас да загадчыка лабараторыі крышталеоптыкі. Падымацца па службовай лесвіцы яму дапамагала высокая кваліфікацыя, важкія навуковыя дасягненні і, што асабліва важна, уменне працаваць з людзьмі, уменне з'ядноўваць і накіроўваць у адно рэчышча іх навуковыя намаганні і творчыя задумы.

Кожны, хто працаваў побач з Барысам Васільевічам, заўсёды паважаў і цаніў яго за душэўнасць і чалавечую дабрату. Памятаецца, да Б. В. Бокуця звярталіся з разнастайнымі просьбамі не толькі супрацоўнікі падначаленай яму, але і многіх іншых



лабараторый інстытута. І заўсёды з яго боку знаходзілі разуменне становішча, падтрымку. Для Барыса Васільевіча асабліва характэрна ўменне разбірацца ў людзях, якія яго акружаюць, з якімі ён супрацоўнічае.

У Інстытуце фізікі Б. В. Бокуць распрацаваў метады карэктнага рашэння гранічных задач ў электрадынаміцы аптычна актыўных крышталяў, вывучыў заканамернасці распаўсюджвання, адлюстравання і пераламлення электрамагнітных хваляў у такіх крышталях. Пасля з'яўлення магутных аптычных квантавых генератараў вучоны інтэнсіўна працуе ў галіне нелінейнай крышталеоптыкі. Ён даследаваў эфектыўнасць генерацыі сумарных, рознасных і падвоеных частот у залежнасці ад уласцівасцей выпраменьвання і параметраў крышталяў. Дэталёва разгледжана ўзаемадзеянне хваляў розных палярызацый і ўздзеянне геаметрыі нелінейнага крышталя на працэс пераўтварэння. Высветлены таксама многія аспекты з'явы нелінейнай аптычнай актыўнасці і электрагірацыі, вывучана нелінейнае пандэраматорнае дзеянне магутнага выпраменьвання на крышталі.

Характэрная асаблівасць даследаванняў Б. В. Бокуця — давядзенне вынікаў работы да пастаноўкі эксперыменту. Ім распрацаваны метады эксперыментальнага вызначэння ўсіх параметраў актыўнасці крышталяў па вымярэнню палярызацыі адлюстраванага і прайшоўшага выпраменьвання.

На рахунку Барыса Васільевіча больш 80 навуковых прац. Вынікі яго даследаванняў дакладваліся на Ўсесаюзных Фёдараўскіх сесіях і канферэнцыях па нелінейнай оптыцы, на розных секцыях і нарадах, дзе яны атрымалі высокую ацэнку віднейшых спецыялістаў.

Б. В. Бокуць сумесна са сваімі супрацоўнікамі атрымаў некалькі аўтарскіх пасведчанняў на вынаходніцтвы ў галіне нелінейнай оптыкі. Асаблівую каштоўнасць мае прапанаваны ім новы спосаб стварэння ўмоў фазавага ўзгаднення пры пераўтварэнні частаты святла, вылучаемага магутнымі лазернымі крыніцамі. Гэты спосаб знайшоў шырокае прымяненне ў розных прыборах і навуковых даследаваннях не толькі ў Савецкім Саюзе, але і за яго межамі. Гэта вынаходніцтва ўвайшло састаўной часткай, напрыклад, у самы дасканалы ў СССР лазер на аснове арганічных злучэнняў «Радуга», створаны ў Інстытуце фізікі АН БССР.

На нашу думку, вялікую каштоўнасць маюць і сёлетнія навуковыя распрацоўкі Б. В. Бокуця. Заяўкі на іх як на вынаходніцтва знаходзяцца на разглядзе Камітэта па справах вынаходніцтваў і рацыяналізацыі.

Займаючыся мэтанакіравана навуковымі пошукамі, Барыс Васільевіч як вучоны-камуніст праяўляе вялікія клопаты і аб падрыхтоўцы маладых кадраў. Пад яго навуковым кіраўніцтвам абаронена 5 кандыдацкіх дысертацый, а яшчэ чатыры аспіранты і столькі ж спабортнікаў на атрыманне вучонай ступені працуюць над дысертацыямі.

Навуковыя заслугі, адміністрацыйная, грамадская дзейнасць Барыса Васільевіча Бокуця знайшлі шырокае прызнанне. Сведчаннем гэтага з'яўляецца выбранне яго членам-карэспандэнтам АН БССР і дэпутатам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, узнагароджанне Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. Прызнанне і ў тых цёплых, шчырых словах, якія выказаны ў яго адрас з нагоды 50-годдзя з дня нараджэння.

Так, за плячыма Б. В. Бокуця пражытае паўстагоддзе. Па працягласці гэта не так і многа. Калі ж мераць па дасягнутаму, дык на рахунку Барыса Васільевіча — багатыя здабыткі. І будуць яны яшчэ значна большыя, бо вучоны знаходзіцца ў росквіце сваіх сіл, якія спаўна аддае для айчыннай навукі, для падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў.

**У. СТАРЫКАЎ**, дэкан фізічнага факультэта.
**М. КАЗАК**, загадчык кафедры агульнай фізікі.
**А. СЕРДЗЮКОЎ**, в. а. загадчыка кафедры оптыкі.

**З вытворчай нарады**

# ПАВЫШАЦЬ КАЭФІЦЫЕНТ КАРЫСНАГА ДЗЕЯННЯ

**Як паведамлялася ў папярэднім нумары нашай газеты, 21 кастрычніка адбылася вытворчая нарада прафесарска-выкладчыцкага, вучэбна-дапаможнага і адміністрацыйна-гаспадарчага саставу ўніверсітэта. На нарадзе быў заслуханы і абмеркаваны даклад прарэктара па вучэбнай рабоце дацэнта Д. А. Лявончанкі. Ніжэй мы змяшчаем пераказ яго даклада «Вынікі 1975/76 навучальнага года і задачы ўніверсітэта ў новым навучальным годзе».**

У ПАЧАТКУ свайго даклада Д. А. Лявончанка сказаў аб тых задачах, якія пастаўлены перад вышэйшай школай XXV з'ездам КПСС. Іх вырашэнне ў многім залежыць ад кадраў. Аднак папранейшаму імі ўкамплектаваны яшчэ не ўсе кафедры. Пажадана таксама, каб выкладчыкамі працавала больш людзей з вучонымі ступенямі і званнямі. Гэты паказчык ва ўніверсітэце пакуль што яшчэ нізкі — 36,6 працэнта. Адзначана неабходнасць смялей прыцягваць да выкладчыцкай работы лепшых выпускнікоў ГДУ. Таленавітая моладзь папоўніць і рады вучоных.

Для павышэння адказнасці выкладчыкаў за вучэбна-выхаваўчую, навукова-даследчую работу, рацыянальнага выкарыстання навукова-педагагічных кадраў вялікае значэнне будзе мець распрацаваны на бягучы навучальны год тыповы штат універсітэта, які ўлічвае аб'ём і віды педагагічнай нагрузкі выкладчыкаў. Цяпер патрабуецца ўзмацніць кантроль за планаваннем работы прафесарска-выкладчыцкага саставу.

Больш увагі патрэбна звяртаць лекцыям — вядучай форме навучальнага працэса ў ВНУ. Іх якасць у многім залежыць ад таго, як выкладчыкі адносяцца да павышэння свайго кваліфікацыйнага ўзроўню. На жаль, асобныя з іх яшчэ да гэтага часу не прайшлі перападрыхтоўку на ФКП або ў ІПК, за што былі падвергнуты справядлівай крытыцы.

У цяперашняй пяцігодцы, падкрэсліў дакладчык, работа, звязаная з павышэннем кваліфікацыі выкладчыкаў, атрымае далейшае развіццё. Ва ўніверсітэце па ёй складзены канкрэтныя планы, ахопліваючыя ўвесь прафесарска-выкладчыцкі састаў.

Важнейшым паказчыкам дзейнасці кожнай ВНУ з'яўляюцца вынікі здачы дзяржаўных экзаменаў, зімовых і веснавых сесій. У мінулым навучальным годзе абсалютная паспяховасць на дзяржаўных экзаменах па дзённаму аддзяленню склала 99,9 працэнта. Выдатныя адзнакі склалі 31,3 працэнта, добрыя — 47,3. Важна, што з году ў год ва ўніверсітэце расце колькасць студэнтаў, якія заканчваюць сваё навучанне напісаннем дыпломных работ.

А вось вынікі, з якімі закончылі веснавую сесію студэнты пераводных курсаў. Самая высокая абсалютная паспяховасць аказалася на біялагічным факультэце — 98 працэнтаў. На гісторыка-філалагічным яна склала 96,1, на эканамічным — 94,1, на геалагічным — 89,7, на фізічным — 88,6, на механіка-матэматычным — 84,2 і на факультэце фізічнага выхавання — 82,3.

Паспяховасць на завочным факультэце склала 70, а на вячэрнім аддзяленні — 81,1 працэнта.

На дзённым аддзяленні папранейшаму яшчэ мала студэнтаў, якія вучацца толькі на «выдатна» — усяго 8,3 працэнта. Трывожным з'яўляецца тое, што яшчэ многія студэнты вучацца на адны здавальняючыя адзнакі — 6,9 працэнта. Гэта на 1,3 працэнта больш, чым было ў папярэднім навучальным годзе. Па гэтаму паказчыку асабліва не зайздросна выглядаюць біялагічны факультэт і факультэт фізічнага выхавання, дзе круглых троечнікаў мелі адпаведна 15 і 14,6 працэнта.

Барацьба за якаснае павышэнне ведаў студэнтаў, змяншэнне іх «адсеву» — адна з галоўных задач выкладчыцкага калектыву ўніверсітэта.

Усямерна патрэбна ўмацоўваць і дысцыпліну студэнтаў. Нельга мірыцца з такім фактам, як 61280 прапушчаных гадзін лекцыйных і семінарскіх заняткаў без уважлівых прычын (58 працэнтаў да ўсёй колькасці прапушчаных заняткаў на дзённым аддзяленні).

Д. А. Лявончанка ў сваім дакладзе расказаў таксама аб рабоце падрыхтоўчага аддзялення, даўшы высокую адзнаку гэтай апраўдаўшай сябе пачатковай ступені падрыхтоўкі спецыялістаў.

Сказаўшы далей аб наборы студэнтаў на першы курс бягучага навучальнага года, дакладчык зазначыў, што ва ўніверсітэце ўжо цяпер зноў неабходна вызначыць састаў прыёмнай камісіі і выпрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы на 1977 год і ажыццяўляць іх, каб забяспечыць якасны прыём абітурыентаў.

Потым дакладчык спыніўся на пытаннях арганізацыі вучэбнай работы, далейшага паглыблення спецыялізацый. Адзначана, што многія кафедры добра плануюць работу і праводзяць яе згодна графіка, а вынікі кантролю падрабязна аналізуюцца і робяцца адпаведныя запісы ў спецыяльных журналах або ў пратаколах кафедры. У дакладзе названы прозвішчы загадчыкаў кафедраў М. М. Грынчыка, У. В. Анічэнкі, А. С. Кіма, А. Н. Бекарэвіча, В. А. Балакіна і іншых ,хто рэгулярна наведвае лекцыі выкладчыкаў, імкнецца абагульняць і пашыраць лепшы вопыт.

У дакладзе было сказана таксама аб той рабоце, якая праводзіцца з маладымі выкладчыкамі.

Адначасова крытыкаваліся тыя загадчыкі кафедр, якія яшчэ недастаткова ажыццяўляюць кантроль за правядзеннем заняткаў.

Д. А. Лявончанка гаварыў аб паляпшэнні выкарыстання ў вучэбным працэсе электронна-вылічальных машын, тэхнічных сродкаў навучання, удасканальванні вучэбна-даследчай і навуковай работы студэнтаў.

У дакладзе знайшлі дастаткова поўнае асвятленне пытанні арганізацыі і правядзення практык студэнтаў, матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння факультэтаў, кафедр і лабараторый. Адзначана неабходнасць выхавання ў студэнтаў пачуццяў ашчадных адносін да ўніверсітэцкай маёмасці, умацавання працоўнай дысцыпліны сярод выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. Асабліва недапушчальна, калі некаторыя з іх спазняюцца на работу, не ў назначаны час пачынаюць або зусім зрываюць заняткі.

У канцы даклада Д. А. Лявончанка выказаў цвёрдую ўпэўненасць, што ўніверсітэцкі калектыў, дзейнасць якога цяпер характарызуецца высокім палітычным уздымам, унясе дастойны ўклад у выкананне задач, пастаўленых перад вышэйшай школай XXV з'ездам КПСС.

# НАВІНЫ КУЛЬТУРНАГА ЖЫЦЦЯ

Днямі ва ўніверсітэце адбылася І-я лекцыя з цыкла «Псіхалогія і этыка сям'і», арганізаваная для студэнтаў і выкладчыкаў ГДУ Гомельскай абласной арганізацыяй таварыства «Веды».

Звыш 250 чалавек праслухалі лекцыю «Праблемы сям'і і шлюбу ў СССР». З ёй выступіў вучоны з г. Ленінграда, кандыдат філасофскіх навук А. М. Чаркасаў. На зададзеныя пытанні слухачоў былі даны вычарпальныя адказы.

□

Авеяны слаўным мінулым горад - прыгажун Ленінград вабіць да сябе турыстаў з самых розных куткоў нашай краіны. Знаёмства з горадам, дзе кожны дом, кожны камень — сама гісторыя, пакідае глыбокі след у душы кожнага, хто пабывае тут.

Супрацоўнікі нашага ўніверсітэта таксама неаднаразова мелі магчымасць наведаць горад над Нявой, пазнаёміцца з яго архітэктурнымі і гістарычнымі помнікамі, скарбніцай мастацтваў — Эрмітажам, мемарыяльнымі Піскароўскімі могілкамі, музеямі, выстаўкамі айчыннага і замежнага мастацтва. Так, у мінулыя выхадныя дні больш 20 супрацоўнікаў ГДУ выязджалі турыстычным поездам у гарады Ленінград і Выбарг. Экскурсія была арганізавана мясцкомам універсітэта. Надоўга запамятаюць яе ўдзельнікі непаўторную прыгажосць плошчаў і праспектаў Ленінграда, своеасаблівую архітэктуру старажытнага г. Выбарга, што знаходзіцца непадалёку ад Фінляндыі.



**Наталля Новікава — вядучая салістка вакальна-інструментальнага ансамбля «Сонейка». Яе чысты голас, манера выканання заслужылі вялікае прызнанне ў прыхільнікаў эстраднага мастацтва. Вясной этага года яна была ўдастоена звання лаўрэата і дыплома 1-й ступені сярод салістаў-вакалістаў на рэспубліканскім конкурсе савецкай эстраднай песні «Юнацтва Палесся-76», які праходзіў у г. Светлагорску.**

НА ЗДЫМКУ: Н. Новікава ў час выступлення (па-за конкурсам) на конкурсе «Ану, першакурснік!» эканамічнага факультэта.

Фота А. Мажарава.

# ПАЛАЖЭННЕ АБ VIII КРУГЛАГАДОВАЙ УНІВЕРСІЯДЗЕ

**(Заканчэнне. Пачатак у нумары 29).**

### ПРАГРАМА І ЎМОВЫ ЗАЛІКУ Ў СПАБОРНІЦТВАХ ПА АСОБНЫХ ВІДАХ СПОРТУ

1. **Баскетбол, валейбол.**

Састаў каманд — згодна правіл спаборніцтваў.

Спаборніцтвы праводзяцца па кругавой сістэме ў адзін круг. Залік: перамога — 2 ачкі, паражэнне — 0 ачкоў. Месцы вызначаюцца па найбольшай колькасці ачкоў. За дзве няяўкі каманды здымаюцца са спаборніцтваў і іх вынікі анулююцца.

У агульнакамандны залік спартакіяды ідуць вынікі адной каманды. У выпадку роўнасці ачкоў у дзвюх каманд месцы вызначаюцца па выніках гульняў паміж імі.

У выпадку роўнасці ачкоў у трох і больш каманд месцы вызначаюцца:

— у баскетболе — па лепшай розніцы забітых і прапушчаных ачкоў у гульнях гэтых каманд. Калі ж і тут роўнасць — першынство вызначаецца ў гульнях паміж усімі камандамі;

— у валейболе — па лепшай розніцы выйграных і прайграных партый у гульнях адпаведна вышэй сказанага.

### II. БАРАЦЬБА КЛАСІЧНАЯ, БАРАЦЬБА ВОЛЬНАЯ, БАРАЦЬБА САМБА

Спаборніцтвы асабіста-камандныя. Састаў каманды неабмежаваны. Камандны залік — па 8 лепшых выніках, незалежна ад вагавай катэгорыі па найбольшай колькасці набраных ачкоў згодна данага палажэння. За 1-е месца — 16 ачкоў, за 2-е — 13 ачкоў, за 3-е — 12 ачкоў і г. д.

### III. ЛЁГКАЯ АТЛЕТЫКА

Спаборніцтвы агульнакамандныя. У камандны залік ідуць 2 вынікі па кожным відзе незалежна ад полу. На кожны від выстаўляецца не больш 4-х чалавек. Кожны ўдзельнік мае права выступаць у двух відах і эстафеце.

Каманднае першынство вызначаецца па найбольшай суме набраных ачкоў (табліца 1962 г.).

**Праграма:**

Бег: 100, 200, 300, 400 м, эстафета 4×100;

Скачкі: у даўжыню, у вышыню;

Кіданне: ядро.

### IV. ЛЁГКААТЛЕТЫЧНЫ КРОС (АСЕННІ І ВЯСЕННІ)

Спаборніцтвы агульнакамандныя. Састаў каманды — неабмежаваны.

Залік — па 25 лепшых выніках, незалежна ад полу і дыстанцыі.

Каманднае месца вызначаецца па найменшай суме ачкоў-месцаў.

**Праграма:**

Мужчыны — 1000 м, 3000 м.

Жанчыны — 500 м, 1000 м.

### V. ПЛАВАННЕ

Спаборніцтвы агульнакамандныя.

Састаў каманды неабмежаваны.

**Праграма:**

в/с 100 м,

брас 100 м,

спіна 100 м,

дэльфін 100 м,

эстафета 4×100 м.

Залік — па 6 лепшых выніках, незалежна ад дыстанцый і полу, і па эстафеце.

Кожны ўдзельнік мае права выступаць не больш чым у 2-х відах праграмы, не ўлічваючы эстафеты.

Асабістыя месцы вызначаюцца па лепшаму выніку.

Агульнакаманднае месца вызначаецца па найменшай суме месц заліковых удзельнікаў.

### VI. МНАГАБОР'Е КОМПЛЕКСУ ГПА

Агульнакаманднае першынство вызначаецца па зімоваму і летняму мнагабор'ю ГПА асобна.

Агульнакаманднае першынство вызначаецца па суме набраных ачкоў ІІ-х этапаў.

Месцы 1-га этапа вызначаюцца па лепшаму працэнту прыняўшых удзел у спаборніцтвах да колькасці дапушчаных да здачы комплексу:

за 1-е месца — 150 ачкоў, ІІ-е —100, ІІІ-е—80, IV-е — 60, V-е —40, VI-е — 30, VII-е — 20, VIII-е—10.

Месцы ІІ-га этапа вызначаюцца па лепшай суме набраных ачкоў заліковымі ўдзельнікамі згодна табліцы мнагабор'я ГПА.

Удзельнік, які не выступіў у адным з відаў мнагабор'я, здымаецца са спаборніцтваў і ачкі, набраныя ім у іншых відах, ліквідуюцца.

Устанаўліваюцца дадатковыя заахвочвальныя ачкі факультэтам:

1. Выканаўшым у спаборніцтвах двух этапаў разрадныя нарматывы: м/с—80 ачкоў;

1-ы разрад — 30 ачкоў;

масавыя разрады — 2 ачкі за кожнага.

### VII. ЛЫЖНЫ СПОРТ

Спаборніцтвы агульнакамандныя, праходзяць у 2 туры. 1-ы тур—снежань,—эстафеты: мужчыны 4×5 км, жанчыны 3×3 км.

Залік — па дзвюх эстафетах незалежна ад полу.

ІІ-ы тур — сакавік, — лыжныя гонкі: мужчыны 10—15 км, жанчыны 5—8 км.

Састаў каманды ІІ-га тура неабмежаваны. Залік — па двух лепшых выніках на кожнай дыстанцыі. Каманднае месца вызначаецца па табліцы ачкоў.

### VIII. ФЕХТАВАННЕ

Спаборніцтвы агульнакамандныя.

Састаў каманды: 4 чалавекі (3 мужчыны і 1 жанчына). Спаборніцтвы праводзяцца па ўсіх відах зброі. Сістэма правядзення кругавая. Каманднае месца вызначаецца па найменшай суме набраных ачкоў.

### IX. СТРАЛКОВЫ СПОРТ

Спаборніцтвы агульнакамандныя.

**Праграма спаборніцтваў:**

1. МВ-1 — стральба лежачы— 10 выстралаў (4 чалавекі ад каманды);
2. МВ-7 — стральба з 3-х палажэнняў — 30 выстралаў (адзін мужчына, адна жанчына);
3. ВП-2 — стральба стоячы — 20 выстралаў (адзін мужчына, адна жанчына).

Адзін удзельнік можа выступаць не больш, чым у 2-х відах праграмы. Асабістае першынство ў практыкаванні вызначаецца найбольшай сумай выбітых ачкоў.

Каманднае першынство вызначаецца па найбольшай суме набраных ачкоў усімі заліковымі ўдзельнікамі згодна данага палажэння.

### X. ГІМНАСТЫКА СПАРТЫЎНАЯ

Спаборніцтвы агульнакамандныя.

Састаў каманды неабмежаваны. У залік уваходзяць вынікі шасці чалавек, незалежна ад полу.

Месцы вызначаюцца па найбольшай суме балаў у кожным відзе мнагабор'я.

Камандныя месцы вызначаюцца па найбольшай суме ачкоў, налічваемых за кожнае месца ў кожным разрадзе. Юнакі і дзяўчаты 1958—1959 гадоў нараджэння могуць выступаць па праграме майстроў спорту па адвольнай праграме двойчы.

**М/С**

1-е месца — 30, 2-е — 28, 3-е — 26 і г. д., за 12-е — 8.

**КМС**

1-е месца — 26, 2-е — 24, 3-е — 22 і г. д., за 12-е — 4.

**1-ы разрад**

1-е месца — 24, 2-е — 22, 3-е — 20 і г. д., за 12-е — 2.

**ІІ-гі разрад**

1-е месца — 18, 2-е — 16, 3-е — 14 і г. д., за 12-е — 1.

**ІІІ-ці разрад**

1-е месца — 12, 2-е — 11, 3-е — 10 і г. д., за 12-е — 1.

Ачкі па ўсіх разрадах налічваюцца пры выкананні 80 працэнтаў ад максімальна магчымай сумы балаў. Пры выкананні менш 80 працэнтаў ачкі за занятыя месцы памяншаюцца ўдвая.

### XI. ШАХМАТЫ

Спаборніцтвы агульнакамандныя.

Састаў каманды — 5 чалавек (4 мужчыны і 1 жанчына).

Спаборніцтвы праводзяцца па кругавой сістэме па нумарах дошак. Агульнакаманднае першынство вызначаецца па найбольшай суме набраных ачкоў. Чэмпіён універсітэта вызначаецца сярод жанчын і на 1-й дошцы сярод мужчын. Перамога — 1 ачко, нічыя — 0,5 ачка, паражэнне — 0 ачкоў. Каманднае першынство вызначаецца па найбольшай суме набраных ачкоў усімі ўдзельнікамі. У выпадку роўнасці набраных ачкоў месцы вызначаюцца па выніку першай дошкі сярод жанчын.

### XII. ЦЯЖКАЯ АТЛЕТЫКА

Спаборніцтвы агульнакамандныя. Састаў каманды — 5 чалавек, незалежна ад вагавай катэгорыі. У залік факультэтам ідуць месцы з 1-га па 9-е. Каманднае першынство вызначаецца па найменшай суме занятых месцаў заліковымі ўдзельнікамі.



**У чаканні абеду.**

Фота А. Шчыгрова.

## • АБ'ЯВЫ • ПАВЕДАМЛЕННІ

**На базе санаторыя - прафілакторыя працуе цэнтр па рэабілітацыі спартсменаў. Студэнты - спартсмены могуць звяртацца за кансультацыямі да прафесара А. С. Калугіна па аўторках на медпункце ГДУ з 17 да 18 гадзін.**

• • •

**Пры медпункце ўніверсітэта ўзнавіліся кансультацыі высокакваліфікаваных спецыялістаў - медыкаў.**

**Графік кансультацый:**

**Панядзелак — тэрапеўт.**

**Аўторак — хірург.**

**Серада — тэрапеўт.**

**Чацвер — хірург.**

**Пятніца — па цотных чыслах — тэрапеўт, па няцотных — псіханеўролаг.**

**Час кансультацый — з 17 да 18 гадзін.**

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

АЗ 05673

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ, профкома и месткома Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю, Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш.

Наш адрас: вул. Савецкая, 104, галоўны корпус ГДУ, П. 5-3, Т. 6-27-71. Фармат 600×420 мм, Тыраж 2000 экз.

Заказ 6791